**І. П. Аксянюк,**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі Маларыцкай раённай гімназія

**Класная гадзіна**
**«Такі спрадвечны лёс мужчын «**

**Задачы** класнай гадзіны:
- выхоўваць пачуццё грамадзянскай адказнасці перад сваёй Радзімай, паважлівыя адносіны да людзей – абаронцаў Радзімы мінулага і сучаснасці;
- садзейнічаць зацікаўленасці вучняў да вывучэння гісторыі свайго роду;
- фарміраваць навыкі культуры паводзін пры абмеркаванні пытанняў ваеннай тэматыкі .

**Падрыхтоўчая работа да правядзення класнай гадзіны:**
Работа вучняў у дамашніх сямейных архівах, пошук армейскіх пісем і фотаздымкаў розных часоў.
Падрыхтоўка выставы ваеннага фотапартрэта.
Стварэнне воінскай геаграфічнай карты класа.
Распрацоўка сцэнарыя класнай гадзіны і музычнага суправаджэння.
Падрыхтоўка пытанняў віктарыны і неабходных матэрыялаў для конкурсаў.
Афармленне запрашэнняў гасцям – удзельнікам класнай гадзіны.

Для таго каб выклікаць у вучняў цікавасць да падрыхтоўкі класнай гадзіны, ім прапануецца адказаць на наступныя пытанні:
- ✓ Ці ведаеш ты, што адным з абавязкаў мужчыны ў нашай дзяржаве з'яўляецца служба ў арміі?
- ✓ Ці ведаеш ты, у якіх вайсках служылі твой бацька, дзед, іншыя родзічы?
- ✓ Ці знаёмы ты з рэліквіямі, якія засталіся ў тваіх родных пасля службы ў арміі?
- ✓ Ці захоўваюцца ў вашым доме армейскія пісьмы ?
- ✓ У якім званні закончылі службу твае родныя?
- ✓ Ці маюць яны вайсковыя ўзнагароды? За што яны былі атрыманы?
- ✓ Ці лічыш ты сваім абавязкам служыць ва Узброенных Сілах РБ?

**Абсталяванне**
Карта былога СССР , на якой чырвонымі зорачкамі адзначаны месцы, дзе служылі бацькі і дзядулі вучняў класа.
Выстава фотаздымкаў родных вуняў часоў армейскай службы.
На экране – назва класнай гадзіны і спіс гасцей – родных вучняў, якія служылі ў розныя часы ў арміі.

**Сцэнарый правядзення класнай гадзіны**

Пад музыку з кінафільма «Афіцэры» (аўтар музыкі Р.Хозак, слоў – Я.Аграновіч) выходзяць вядучыя і класны кіраўнік.

**Класны кіраўнік:**

Колькі раз Вам казалі: «Трэба!»
Колькі раз наперад ішлі.
А навокал – у зорах неба
І абшар нашай роднай зямлі.

Афіцэры – заўжды афіцэры.
Не чакаюць сабе ўзнагарод.
Нездарма афіцэрам даверыў
Лёс зямлі беларускай народ

Мы на Вас спадзяёмся і верым:
Беларусь нашу больш не спаліць!
Афіцэры - таму афіцэры,
Што за край родны сэрца баліць.

Гэтымі словамі палкоўніка запасу Узброеных Сіл Беларусі Сяргея Макея я хачу пачаць нашу сустрэчу, прысвечаную самай мірнай і самай ваеннай прафесіі на зямлі – салдацкай. Ёсць абарона ў дзяржавы – значыць ёсць, жыве сама дзяржава. Няма абароны – няма і самой краіны, яна проста знікне з твару Зямлі. Слава людзям, якія ў ваенны і мірны час маюць мужнасць стаць на абарону сваёй Радзімы!

1-ы вядучы: Нашы дзеды і прадзеды ў гады Вялікай Айчыннай вайны не шкадавалі свайго жыцця, каб прагнаць ворага з нашай зямлі, знішчыць яго ў самім логаве. Яны верылі ў перамогу, што на нашай зямлі будзе мір і спакой.

**2-гі вядучы:**

Даказана і войнамі, і голадам,
Што падаюць раней
Мужчыны-волаты.
Жанчыны ж
Застаюцца жыць удовамі,
Засмучаныя думкамі бядовымі.

Таму
Спачатку падалі мужчыны,
Бо аддавалі свой паёк нішчымны
Матулям,
Любым жонкам
І каханым,
А самі паміралі нечакана.

Яны хацелі,
Каб хоць дзень-другі

Жыццё прадоўжыць родным, дарагім.
А там —
Не стане голаду, вайны.
А там, глядзіш,
Народзядца сыны...

З такою думкай падалі яны.

**1-ы вядучы:** Закончылася вайна. Краіна пачала залечваць свае раны. І ўсюды разам са сваёй Радзімай была яе армія. У часы барацьбы і ў часы мірнай, але цяжкай працы. Армія дапамагала разбіраць завалы, адбудоўваць гарады і вёскі, праводзіць дарогі.

**2-гі вядучы:** Але ніколі армія не забывала пра свой самы святы абавязак, пра справу, якой яна прысягала – абараняць Радзіму .

**1-ы вядучы:** Сёння ў нас прысутнічаюць госці, якія, прыняўшы эстафету з рук сваіх бацькоў, у мірны час выконвалі свой воінскі абавязак.

**2-гі вядучы:** Сёння ў нас у гасцях бацькі і дзеды нашых вучняў, якія служылі ў арміі ў розныя часы. Яны прыйшлі да нас, каб падзяліцца сваімі ўспамінамі аб воінскай службе. Давайце прывітаем іх апладысментамі!

*На сцэну выходзяць госці. Першым выступае дзядуля вучаніцы Сідарук Мікалай Васільевіч, які служыў у радах Савецкай Арміі з 1970 па 1972 год. Ён успамінае, як адносіліся да воінскага абавязку маладыя людзі, калі яшчэ існаваў Савецкі Саюз. Мікалай Васільевіч прынёс з сабою свае армейскія пісьмы, якія ён пісаў сваім родным з арміі і якія захаваліся ў сямейных архівах. Зачытваецца ўрывак з пісьма: « Вот сегодня, т.е. 20 декабря, я принял Воинскую Присягу, и для меня этот день запомнится на всю жизнь. Даже погода была праздничная. Деревья покрылись белым красивым инеем, мороз, без ветра, и на улице красиво-красиво. В 10 утра было построение, и где-то в 11 часов я с автоматом на груди принял присягу. Так что я уже полноценный гражданин Союза ССР и за все свои поступки буду нести полную ответственность…»*

*Другім выступае бацька вучня Вашчынчук Леанід Іванавіч, які служыў на Савецка-Кітайскай мяжы ў пачатку 80-х гадоў. Ён расказаў аб атмасферы, якая панавала на мяжы ў той час, аб адказнасці воінаў-пагранічнікаў, якія абаранялі рубяжы сваёй Радзімы.*

*Трэцім выступае Федасюк Раман Мікалаевіч, які праходзіў воінскую службу ў падраздзяленні супрацьпаветранай абароны ў Ленінградскай вобласці з 1988 па 1990 гады. Ён таксама падзяліўся з прысутнымі сваімі ўспамінамі аб воінскай службе, як салдаты адчувалі адказнасць за сваю Радзіму, за мір і спакой сваіх родных.*

*Затым усе астанія вучні, чые бацькі не змаглі прыйсці на сустрэчу, расказвалі, дзе, калі і ў якіх вайсках служылі іх бацькі і, падыходзячы да карты былога СССР і карты Усходняй Еўропы, адзначалі зорачкамі месцы, дзе служылі іх бацькі.*

**1-ы вядучы:** Ганаровую воінскую геаграфічную карту нашага класа лічыць адкрытай!
**2-гі вядучы:** Сёння мы жывём у іншай дзяржаве – Рэспубліцы Беларусь. Яна не такая вялікая і магутная, як быў Савецкі Саюз. Але гэта не значыць, што нашы Узброеныя Сілы не павінны быць такімі ж моцнымі. Каб мірна жыў і працаваў на сваёй зямлі наш народ, армія стаіць на варце.
**1-ы вядучы:**
Блакіт тэлевізійнага экрана,
Скупы радок газетнай паласы
Прыносяць зноў навіны...
Несціхана
Пакутай, болем ныюць галасы.

Не ведаю,
куды ад іх падзецца,
Я ж чалавек —
і не ўсё роўна мне,
Што галадаюць, паміраюць дзеці,
Хоць і ў чужой далёкай старане,

Што не змаўкае гул ні ўдзень, ні ўночы
І не мялее бежанцаў рака...
Вайны пярун над Афрыкай рагоча,
Над Азіяй ягоная рука.

Забойцам жа і гэтага замала,
Крыві іх долар прагне,
нібы цмок.
Зямля людзей,
над прорваю ты стала,
Да небыцця адзін застаўся крок.

Прашу ўвесь свет,
што б'ецца ў ліхаманцы:
— Рыдлёўку не бяры ты за цаўё.,.
Жыць на Зямлі хачу,
а не ў зямлянцы...
Няўжо жаданне марнае маё?

**2-гі вядучы:** Каб наш народ жыў і працаваў мірна на нашай зямлі, армія павінна быць моцнай. І мы, будучыя салдаты, ужо цяпер павінны рыхтаваць сябе да свяшчэннага абавязку – абараняць Радзіму. І сёння мы пабачым, наколькі гатовы да будучых выпрабаванняў нашы хлопчыкі. Прыступаем да спаборніцтваў.

*Выходзяць 2 каманды хлопчыкаў па 4-5 чалавек.*

**1-ы вядучы:**
Мы запрашаем заняць свае месцы журы, якое будзе вызначаць, наколькі гатовы да службы ў арміі нашы будучыя салдаты. У журы ў нас уваходзяць нашы госці – тыя, хто добра ведае воінскую службу.
**Конкурсная праграма:**
1 конкурс: Хлопчыкі павінны правільна і на хуткасць завіць парцянкі на ногі і надзець салдацкія боты.
2 конкурс: Хлопчыкам неабходна на хуткасць надзець салдацкі кіцель і рэмень.
3 конкурс: Хлопчыкі атрымліваюць гімнасцёркі, да якіх трэба прышыць каўнерык. Заданне выконваецца на хуткасць.
4 конкурс: На сцэне нацягнута вяроўка на высату не больш як 20 сантыметраў. Трэба прапаўзці пад ёй і не закрануць яе спінай.
5 конкурс: Хлопчыкам неабходна адказаць на пытанні па гісторыі сваёй Радзімы, звязаныя з ваеннымі падзеямі.
**Пытанні віктарыны:**
Чатыры штыкі абеліска Кургана Славы пад Мінскам азначаюць? (Колькасць франтоў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі)
Яе працягласць склала 200 дзён. Аб чым ідзе гаворка? (Сталінградская бітва)
Яе працягласць склала 1100 дзён і начэй. Аб чым ідзе гаворка? (акупацыя сталіцы Беларусі - Мінска)
Бліскучая палітычная кар'ера гэтага будучага лідара Савецкай Беларусі пачалася з арганізацыі падпольнай групы вучняў 10 «А» класа, у якім ён быў класным кіраўніком. Аб кім ідзе гаворка? (П. М. Машэраў)
Гэты савецкі ваенанначальнік быў самым маладым генралам арміі і самым маладым камандуючым фронту за ўсю гісторыю савецкіх Узброенных сіл. Ён назаўсёды ўпісаў сваё імя ў пантэон вайсковай славы Беларусі тым, што камандаваў Трэцім Беларускім фронтам летам 1944 года. Аб кім ідзе гаворка? (І. Д. Чарняхоўскі)
Вялікая Айчынная зрабіла яго героем і самым вядомым беларускім партызанам. У першыя дні яго атрад нанёс ворагу такія страты, што ў Суражскім раёне немцы вывесілі каля дарог аб'явы: «Небяспечна! Партызанская зона». Аб кім ідзе гаворка? (М. П. Шмыроў)
У даваенны час (1926 – 1931 гг.) гэты савецкі палкаводзец выкладаў дапрызыўную падрыхтоўку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Аб кім ідзе гаворка? (Г. К. Жукаў)
У пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны Іосіф Сталін назваў гэты горад «беларускім Мадрыдам», параўноўваючы гераізм яго абаронцаў з гераізмам байцоў рэспубліканскай Іспаніі. Што гэта за горад? (Магілёў)

*Падводзяцца вынікі конкурсаў, аб'яўляюцца пераможцы.*
**Класны кіраўнік:**
Вось і падыходзіць да свайго заканчэння наша сустрэча. Але наша размова пра свой абавязак перад Радзімаю не апошняя. Мы павінны браць прыклад

з нашых прадзедаў, дзядоў і бацькоў, каб аддана і мужна бараніць свой родны край, ахоўваць мірны сон нашых родных.
Тады на нашу зямлю ніколі не прыйдзе вайна.

**1-ы вядучы:**

Калі парадны строй праходзіць міма,
Там крочыць нехта іншы, а не я.
Не я абараняў цябе, Радзіма,
Табе не дапамог я аніяк.

**2-гі вядучы:**

У час, калі стагнала ты ад болю,
Мяне яшчэ на свеце не было.
Якую ты прызначыла мне ролю?
За што спакой мне дорыш і цяпло?

**1-ы вядучы:**

Губляла ты сыноў сваіх і дочак
У жудасныя, цяжкія часы.
Абпалены быў кожны твой куточак,
Ты доўгі час не бачыла расы.

**2-гі вядучы:** Зямля мая, ты выплакала слёзы,
Не трэба больш ні плакаць, ні стагнаць.
Тваіх дзяцей загубленыя лёсы
Нашчадкаў будуць назаўжды яднаць.

**1-ы вядучы:**

Я разумею: мір у нас не дарам,
Дзеля яго змагаліся дзяды.
Ім дзякуючы, мы жывем, мы марым
Пакінуць толькі добрыя сляды.

**2-гі вядучы:** Не бачыў я крыві, не бачыў дыму,
Загінуўшых не чую галасы.

**1-ы і 2-гі вядучыя разам:**

Пашанцавала мне з табой, Радзіма,
Я твой удзячны сын на ўсе часы.